У ПЕРШЫ КЛАС — ТОЛЬКІ ПА МЕСЦЫ ПРАЖЫВАННЯ?

12 чэрвеня распачынаецца прыём дакументаў ад бацькоў першакласнікаў. Падзея быццам бы з разраду шараговых, але толькі не сёлета

Уся справа ў тым, што пасля адмены экзаменаў у пятыя класы гімназій і ўвядзення тэрытарыяльнага прынцыпу замацавання дзяцей за гэтымі ўстановамі дастаткова вялікая колькасць бацькоў засталіся такім рашэннем незадаволеныя і пачалі шукаць спосабы займець рэгістрацыю ў патрэбным доме, якая, на іх думку, дае шанц трапіць у жаданую ўстанову (не толькі ў першы, але і ў пяты клас).

Канешне, найбольш актуальная гэта сітуацыя для Мінска, дзе функцыянуе 50 гімназій, прычым пяць з іх раней не мелі пачатковых класаў. Дзве з апошніх усё ж такі набяруць першакласнікаў (13-я і 27-я гімназіі), але ў трох (№№ 25, 41 і 42) набору пакуль не будзе. А гэта значыць, што тут таксама ўключаецца тэрытарыяльны прынцып набору ў пятыя класы.

Дарэчы, у 2017/2018 навучальным годзе ў краіне дзейнічалі 215 гімназій, з іх 28 не мелі пачатковай школы. У шэрагу раённых гімназій, накшталт Маларыцкай, Глыбоцкай ці Шумілінскай раённай гімназіі-інтэрната для сельскіх дзяцей, набор раней ажыццяўляўся толькі ў пятыя класы па выніках уступных іспытаў. Самае дзіўнае, што карысную інфармацыю бацькі могуць знайсці далёка не на ўсіх сайтах устаноў адукацыі. Ці набіраюць яны першыя класы? Як будуць камплектавацца пятыя класы? Якія дамы ці вуліцы замацаваныя за гімназіямі? І сайты раённых аддзелаў адукацыі ў гэтым мала дапамагаюць.

Калі прымалася рашэнне аб адмене экзаменаў, у першую чаргу браўся пад увагу псіхалагічны складнік гэтага пытання: экзамен, як правіла, ствараў вельмі моцнае напружанне для дзяцей. Цяпер жа ўсе дзеці, якія навучаюцца ў чацвёртых класах гімназій, змогуць аўтаматычна перайсці ў пяты клас гэтай жа ўстановы адукацыі. Выключэнне складаюць толькі 5-я класы гімназій-каледжаў мастацтваў, дзе конкурсны адбор па выніках праверкі творчых здольнасцяў па-ранейшаму захоўваецца.

Ёсць яшчэ адзін важны нюанс: у Міністэрстве адукацыі абяцалі, што тэрытарыяльны прынцып адбору дзяцей не будзе дзейнічаць пры камплектаванні беларускамоўных гімназій, бо ў выпадку жорсткай тэрытарыяльнай прывязкі можа паўстаць пытанне з існаваннем такіх устаноў.

У 23-ю мінскую гімназію, размешчаную ў самым цэнтры сталіцы, дзяцей прывозяць з усяго горада. Але на сайце гэтай установы змешчана інфармацыя пра рашэнне адміністрацыі Савецкага раёна аб замацаванні за гімназіяй пэўных дамоў. «Дзеці, якія не пражываюць на тэрыторыі мікрараёна, могуць быць залічаны на свабодныя вучнёўскія месцы. Залічэнне на свабодныя месцы ажыццяўляецца ў парадку чарговасці падачы заяў законнымі прадстаўнікамі вучняў», — паведамляецца на афіцыйным інтэрнэт-рэсурсе. У той жа час за мінскай гімназіяй № 4, размешчанай у спальным мікрараёне сталіцы, ніякіх дамоў не замацавана. Тут плануюць набраць чатыры першыя класы — усяго 96 чалавек. Прыём дакументаў будзе ажыццяўляцца ў парадку чарговасці падачы заяў.

Па словах **начальніка аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі Камітэта па адукацыі Марыны ІЛЮШЧЭНІ**, замацаванне за 23-й гімназіяй жыхароў пэўных дамоў не азначае, што туды не змогуць трапіць беларускамоўныя дзеці, якія пражываюць у іншых раёнах. Таксама і жыхары замацаваных за беларускамоўнай гімназіяй дамоў, калі яны жадаюць, каб іх дзіця навучалася на рускай мове, могуць падаць дакументы ў іншую найбліжэйшую да іх установу адукацыі.

Але для таго, каб дзіця, якое не пражывае ў мікрараёне ці дамах, замацаваных за ўстановай адукацыі, магло трапіць туды на свабоднае месца, бацькі павінны запісацца на асабісты прыём да кіраўніка гэтай установы і падаць адпаведную заяву. Пра вынікі яе разгляду камісіяй будзе прымацца рашэнне, аб якім бацькі павінны быць праінфармаваныя не пазней за 30 жніўня.

Школы і гімназіі будуць весці прыём дакументаў з 12 чэрвеня да 28 жніўня (на свабодныя месцы ў іншыя ўстановы — з 13 чэрвеня). **У першую чаргу ўстанова адукацыі абавязана прыняць усіх дзяцей, якія замацаваныя за канкрэтнай гімназіяй ці школай.**

Што датычыцца ўзросту патэнцыяльных школьнікаў, то ў першы клас прымаюцца дзеці, якім на 1 верасня споўнілася шэсць і больш гадоў. Па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў дапускаецца прыём у першы клас дзіцяці, якому шэсць гадоў споўніцца ў перыяд з 1 да 30 верасня адпаведнага навучальнага года.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ТРАМП СПАДЗЯЕЦЦА НА ПОСПЕХ СУСТРЭЧЫ З КІМ ЧЭН ЫНАМ

«Як вы ведаеце, у нас вельмі цікавая сустрэча, і я думаю, што яна пройдзе вельмі добра», — сказаў ён прэм'ер-міністру Сінгапура Лі Сяньлуню. Ён таксама падзякаваў Лі за гасціннасць. Як вядома, першы ў гісторыі саміт ЗША і КНДР, на якім адбудзецца сустрэча амерыканскага прэзідэнта Дональда Трампа і паўночнакарэйскага лідара Кім Чэн Ына, пройдзе сёння ў Сінгапуры. Раней амерыканскі лідар заявіў, што разлічвае на нармалізацыю адносін з КНДР, і не выключыў магчымасці падпісання мірнай дамовы з Пхеньянам. Ён дадаў, што ЗША не прымуць адмову Пхеньяна ад поўнай дэнуклеарызацыі — у такім выпадку санкцыі і ціск сусветнай супольнасці на Пхеньян узмоцняцца.

ЖЫХАРЫ КРАІНЫ БАСКАЎ ПАТРАБУЮЦЬ БОЛЬШАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Дзясяткі тысяч жыхароў Краіны Баскаў — аўтаномнага рэгіёна на поўначы Іспаніі — выстраіліся жывым ланцугом даўжынёй 202 кіламетры з заклікам большай аўтаноміі. Удзельнікі акцыі напісалі свае пажаданні на шыйных хустках. Ланцуг працягнуўся ад гарадоў Сан-Себасцьян і Більбаа на поўначы Іспаніі да Віторыі, сталіцы Краіны Баскаў, дзе знаходзіцца яе парламент. Рэгіён валодае больш высокай ступенню самакіравання, чым Каталонія, якая актыўна дамагаецца незалежнасці ад Мадрыда. У апошнія гады ў Краіне Баскаў падтрымка ідэі незалежнасці некалькі аслабла. Тым не менш многія лічаць, што насельніцтва павінна мець права правесці рэферэндум па пытанні сваіх будучых адносін з Мадрыдам.

ПАДЧАС ТЭРАКТА Ў КАБУЛЕ ЗАГІНУЛІ 12 ЧАЛАВЕК

Акрамя таго, паранена больш за 30 чалавек, паведамляе тэлеканал Tolo News са спасылкай на інфармацыю Міністэрства аховы здароўя Афганістана. Па звестках тэлеканала, тэрарыст-смяротнік падарваўся каля ўваходу ў міністэрства гарадскога аднаўлення і развіцця краіны ў раёне Даруламан. Паводле папярэдніх звестак, у момант выбуху супрацоўнікі міністэрства пакідалі будынак.

АЛЕНУ РАБЭРУ НЕ ДАЛІ СКАРЫЦЬ ХМАРАЧОС У СЕУЛЕ

Французскі «чалавек-павук» Ален Рабэр паспрабаваў падняцца без страхоўкі на 123-павярховы будынка Lotte World Tower. Штурм хмарачоса спыніла служба бяспекі: экстрэмала затрымалі на 75-м паверсе, паколькі ён падымаўся без дазволу. Ахоўнікі ішлі за ім дзве гадзіны ўнутры будынка. Дарэчы, Ален Рабэр за свае дасягненні занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. На яго рахунку — самыя вядомыя хмарачосы планеты, уключаючы вежу «Бурдж-Халіфа» ў Дубаі.

■ Надвор'е

ВІЛЬГАЦІ ГЛЕБЕ НЕ ХАПАЕ... І ДА ПЛЮС 31

На гэтым тыдні чакаюцца толькі кароткачасовыя дажджы і рэдкія навальніцы

Хмарнасць прагназуецца ў аўторак, а далей будзе практычна суха, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У сераду і чацвер наша краіна будзе знаходзіцца ў асноўным у вобласці павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванай ва ўмерана цёплай паветранай масе. Праўда, у паўднёвых раёнах адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які перамяшчаецца па поўначы Украіны. Чакаецца пераменная воблачнасць, будзе пераважна без ападкаў. Толькі ў некаторых раёнах па поўдні магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер умераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, удзень — ад 20 цяпла па паўночным усходзе да плюс 28 градусаў па поўдні краіны.

Пераважна без ападкаў чакаецца і ў пятніцу, толькі месцамі па захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы, часам з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 9 да 16 цяпла, удзень будзе ўжо 22—29 цяпла.

Па звестках Белгідрамета, на выхадных у некаторых раёнах пройдуць кароткія цёплыя дажджы, прашумяць навальніцы. Удзень прагназуецца ад плюс 21 да плюс 28 градусаў, а ў паўднёвых раёнах у гэтыя дні чакаецца ўвогуле гарачыня — 30—31 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Фінансы

Рэзервы крыху знізіліся

Золатавалютныя рэзервы краіны на 1 чэрвеня склалі 6,94 млрд долараў, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

Такім чынам, за май золатавалютныя рэзервы знізіліся на 98,5 млн долараў (на 1,4 %) пасля росту ў красавіку на 43,5 млн долараў (на 0,6 %). Зніжэнне ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў па выніках мая абумоўлена планавым пагашэннем урадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму каля 331 млн долараў.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Будзь у курсе!

У 75 РАЁНАХ НЕЛЬГА Ў ЛЯСЫ

Пра забарону на наведванне лясоў паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.

Такія рашэнні мясцовых улад абумоўлены высокім класам пажарнай небяспекі з-за ўмоў надвор'я. Закрыты для наведвання ўсе лясы Гомельскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Таксама часткова нельга бываць у лясных угоддзях на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

Даведацца актуальную інфармацыю пра ўвядзенне забарон на наведванне лясоў можна на інтэрактыўнай карце на сайце Мінлясгаса. Звесткі на ёй абнаўляюцца па меры ўвядзення ці адмены гэтых забарон.

Толькі за мінулыя выхадныя супрацоўнікі дзяржаўнай лясной аховы ліквідавалі 11 пажараў. Большая частка з іх — шэсць — адбыліся ў Мінскай вобласці. Яшчэ два пажары здарыліся ў Гродзенскай вобласці, па адным зафіксавана ў Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Агульная плошча ўзгарання склала 7,9 гектара.

ЗА АБСТАНОЎКАЙ СОЧАЦЬ «БУСЛЫ»

Спецыялісты дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай установы «Авіяцыя» праводзяць паветраны маніторынг месцаў масавага адпачынку грамадзян з выкарыстаннем беспілотных лятальных апаратаў «Бусел М» на тэрыторыі Мінскага раёна, у прыватнасці, Заслаўскага вадасховішча (Мінскае мора), вадасховішча Пціч і прылеглых тэрыторый.

Увага ўдзяляецца несанкцыянаванаму развядзенню агню, выпальванню травы і сухой расліннасці, загаранням у прыродных экасістэмах, знаходжанню транспартных сродкаў у забароненых месцах і наяўнасці несанкцыянаваных звалак на тэрыторыі, што прымыкае да водных аб'ектаў. У выніку маніторынгу загаранняў у прыродных экасістэмах і парушэнняў правілаў прыродакарыстання не выяўлена. На дадзены момант выканана чатыры палёты беспілотных лятальных апаратаў. З-за высокага класа пажарнай небяспекі ўся пілатаваная авіяцыя МНС таксама знаходзіцца ў паветры і праводзіць маніторынг экасістэм на працягу ўсяго дня.

Сяргей РАСОЛЬКА

■